# Літаратуразнаўства

Т. М. ДЗЯЛЕНДЗІК

## КАМПАЗІЦЫЯ ПАХАВАЛЬНЫХ КАЗАННЯЎ П. СКАРГІ, М. СМАТРЫЦКАГА, І. ГАЛЯТОЎСКАГА

Беларускія і польскія пахавальныя казанні (далей ПК) XVI — XVII стст. як рытарычны жанр характарызуюцца шэрагам тыповых рыс. ПК уласціва жанравая акрэсленасць і нават пэўная узуальнасць: выбар тэмы, спосабы яе разгортвання, кампазіцыйная структура фрагментаў тэксту падпарадкоўваліся прынятым узорам і таму мелі ўстойлівы, у пэўнай ступені клішыраваны характар. Аказіянальнасць у ПК выяўляецца толькі на ўзроўні прадстаўлення нябожчыка, яго радавога дрэва, фамільнага герба і г. д., а таксама (у значна больш факультатыўнай ступені) у суб'ектыўна-лірычнай індывідуалізацыі «персанажа» казання і асобы аўтара. Сферу функцыяніравання ПК характарызуе абрадавы кантэкст. ПК чыталася ў першай частцы рытуалу пахавання: у жалобным богаслужэнні. Прамова казнадзея знаходзіла сваё адлюстраванне ў дэкаратыўным афармленні катафалка і надмагільнага помніка: асноўная сентэнцыя друкавалася на атласе, стужкі з эпіграфамі казання вывешваліся каля харугваў[1]. ПК, як і іншыя віды казанняў, мог чытаць толькі той, хто знаходзіўся ў сане свяшчэнніка (у праваслаўнай традыцыі казнадзейства без пэўнага іерархічнага сану з'яўлялася выключным фактам[2]).

Па пэўных прыметах (абрадавы кантэкст, царкоўны сан стваральніка тэксту, тэматыка) ПК адрозніваецца ад аратарскіх прамоў, але агульнае падабенства царкоўнага і свецкага красамоўства адзначалася складальнікамі рыторык і гамілетык[3]. Так, І. Галятоўскі ў стварэнні першай праваслаўнай гамілетыкі «Ключъ разуменія казанія» (Кіеў, 1659), у якую побач з узорамі казанняў увайшлі «Наука... зложенія казанія» і «Наука... зложенія казанія на погребе», карыстаўся традыцыйнымі рытарычнымі паняццямі: *ексордіум, нарація, конклюзія, амплефековати* і інш. Звесткі аб кампазіцыі тэксту цалкам і асобных яго фрагментаў знаходзіліся ў рыторыках у частцы dispositio ('размяшчэнне'). На ўзроўні пабудовы ўсяго тэксту рыторыкі XVI—XVII стст. услед за антычнымі ўзорамі вылучалі галоўным чынам тры кампазіцыйныя элементы: exordium ('уступ'), narratio ('выклад'), conclusio ('заканчэнне'). Адрозненне паміж элементамі кампазіцыі мела функцыянальную аснову: галоўнай мэтай exordium'у лічылася дасягненне зацікаўленасці (docilitas), увагі (attentio) і прыхільнасці (benovolentia) слухачоў; прызначэнне narratio — docere ('вучыць'), delectare ('радаваць'), movere ('хваляваць'); мэта conclusio вызначалася ў стварэнні прамовы flexanima ('крануючай')[4].

Кампазіцыя ПК разглядаецца на прыкладах казанняў П. Скаргі — «Kazanie na pogrzebie krolowey polskiey ANNY» (Krakow, 1597) —далей СКАРГА-1; Pogrzebne kazanie wtore» (Krakow, 1600) — далей СКАРГА-2; М. Сматрыцкага — «Казанье на честный погребъ... Леонтія

Карповича» (Вільна, 1620) — далей СМАТР.; І. Галятоўскага — «Казанье первое на погребе якого колвекъ чл҃века бл҃гочестиваго» (Львов, 1665) — далей ГАЛЯТ*.

Асноўнае прызначэине exordium'у — **прэзентацыя агульнай тэмы казання.** Фрагменты сфармуляванай у exordium'е тэмы, альбо ўся тэма як пэўная сентэнцыя неаднаразова ўзнаўляюцца ў narratio. Тэматычная заяўка суправаджаецца цытатай са Св. Пісання, якая становіцца вытокам выбранай тэмы і задаецца як эпіграф да тэксту:

/1/ На кароткасць жыцця нашага на гэтай бруднай зямлі ўсе пазіраем... як тут Іоў кажа: кароткія дні людскія, палічыў і акрэсліў Гасподзь Бог дні нашы (СКАРГА-2,115).

У казанні Галятоўскага фармулёўцы тэмы папярэднічае этап эмацыянальнай падрыхтоўкі вернікаў. Кампазіцыя выкладу, які прадугадвае тэму, адпавядае прынцыпам раскрыцця тэзісу ў narratio: I этап —заяўка пэўнай тэмы-тэзісу; II этап — прыклады-сведчанні, якія ілюструюць тэзіс; III этап — вывад з выкладу як паўтор тэмы-тэзісу. Выкарыстанне ілюстрацыйнага матэрыялу для пацвярджэння тэзісу характэрна для ўсіх казанняў, але для Галятоўскага ілюстрацыйнасць з'яўляецца дамінуючым спосабам доказу: прыклады складаюць 2/3 агульнага аб'ёму тэксту.

/2/ Мовіў Прарок Іерэмея да Фасура свяшчэнніка старазапаветнага: Не Фасур заклікаў Гасподзь імя твае, але страх адусюль... можа Прарок Іерэмея і до кожнага чалавека тыя словы мовіць, бо чалавека на свеце з усіх бакоў смерць абкружыла... для таго мусіць чалавек ад усіх бакоў баяцца і спадзявацца смерці, каторую розныя людзі паднялі... Албрымаў вада з Неба саступіўшы затапіла... Егіпцянаў пазабіваў град вялікі, Дадана і Аўірона зямля пажрала расступіўшыся пад імі, Самарыцянаў львы падралі... (ГАЛЯТ. 481).

У першым з разгледжаных казанняў Скаргі дэманструецца незвычайнасць тэмы пры дапамозе супрацьпастаўлення звычайнай мэты ПК («хваліць») і новай найвышэйшай ступені дзеяння («славіць»):

/3/ Па заканчэнні працы і дарогі жыцця гэтага хвалім добрых работнікаў... Не будзем хваліць той нявесты Каралеўскай знатнасці... бо гэта лёгкія і супольныя са злымі дары. Але... славіць яе павінны мы (СКАРГА-1, 124).

У Сматрыцкага ўводзіны да тэмы — гэта дэманстрацыя незвычайнасці самой сітуацыі чытання ПК, што адзначаецца трыма момантамі: казанне чытаецца ім упершыню з гэтага месца; тут, на гэтым месцы, прапаведваў а. Карповіч; зараз яго вучань спраўляе па ім памінальную службу. Гэтыя аспекты разгортваюцца першапачаткова ў перыядах, потым паўтараюцца альбо простым сказам як вынік са сказанага, альбо ў параўнальных канструкцыях, якія канкрэтызуюць аспекты супастаўлення, намечаныя ў перыядзе:

/4/ З Ласкі ўседаравальнага... Духа, звыклым... парадкам на месца гэта... уступаць... адважыўся гэта дня сённяшняга... першы раз учыніць, а з месца гэтага да Міласці вашай... першую маю духоўную Бяседу хутка пачаць... Дзівуешся відаць Вялебны, і ўжо сёння Блажэнны Гаспадзіне мой і Ойча, што я Сын твой і слуга... вітаць цябе, і справу паслугі маёй, на которую мяне быў выслаў (ты), выконваць паступіў (я); што з гэтага мне нязвыклага, а твайго ўласнага месца абодва тое прайсці ўзяўся (я) (СМАТР., 25).

Пасля фармулёўкі тэмы адбываецца раздзяленне яе на падтэмы. Паколькі ў narratio кожная з падтэм мае політэматычны характар, то для адлюстравання іерархічнасці варта выкарыстоўваць паняцце парадкавасці. Такім чынам, у exordium'е адбываецца дзяленне тэмы на рад тэм другога парадку (далей тэмы-2). Паслядоўнасць, з якой аўтар заяўляе тэмы-2, строга вытрымліваецца ў narratio.

/5/ Толькі за тою аказіяй... да Гаспадзіна майго і Айца... спачатку ў адлюстраванні жыцця і смерці звычайным: потым ва ўласным яго жывой душы вобразе: нарэшце ў жывых... Дабрачыннасцях жывую постаць... перад вамі паставіць, задуму ўзяўшы (СМАТР., 30).

Адносна раздзялення тэмы на рад тэм-2 exordium выконвае функцыю сэнсавай рубрыкацыі тэксту.

Этыкетныя формулы — зварот да Бога і слухачоў — маркіруюць заканчэнне exordium'у і пераход да narratio.

/6/ Хрыста Бога аб помачы прашу, ласк вашых аб слуханні (ГАЛЯТ., 481).
/7/ Аб тым будзе казанне гэтае наша за дарам Духа Святога і прычынай Маці Божай, і іншых святых (СКАРГА-2, 115).

---

* Гл.: Галятовский И. Ключ разуменія казанія. Львов, 1665. С. 481 і наст. Казанні Сматрыцкага і Скаргі аналізаваліся па перавыданнях: Маслов С. И. Казанье Мелетия Смотрицкого на честный погребъ о. Леонтия Карповича. Киев, 1908; Skarga P. Kazania przygodne. Wilno, 1738. Усе прыклады па тэхнічных умовах перададзены сродкамі сучаснай графікі ў нашым перакладзе; шматкроп'і ў цытатах зроблены аўтарам артыкула.

У Сматрыцкага зварот да Бога не з'яўляецца звычайным адлюстраваннем прынятай формы заканчэння exordium'у, асаблівасць сітуацыі прадугледжвае і больш разгорнутую форму звароту, пры гэтым аўтар экспліцыруе прычыны і ступень змянення прынятай формы.

/8/ Што калі чыніць бяруся... да Хрыста прадвечнага Бога аб прычыне прашу, каб ён ад жывучага ў цябе багацця прасвятога... Духа ласкі... на мяне царквы яго Святой апошнім слузе паклаў. А поглядам будучых уладаю духоўнаю наложаных на мяне паслуг царкоўных кажу больш адважна (адважвацца таму што ад часу гэтага... і нежадаючаму належыць мне), як на Елісея з міласцю Іліінаю, так на мяне нявартага... асаблівага духа... праліць, выліць каб меў ласку (СМАТР., 29).

**«Вобраз рытара» і самапрадстаўленне аўтара.** У exordium'е ўсіх ПК прысутнічаюць элементы, якія пэўным чынам рэпрэзентуюць камунікатыўную сітуацыю: 1) *адрасат* — зварот да слухачоў. Зварот да Бога ёсць таксама прадстаўленне адрасата прамовы, што ўласціва і некаторым відам культавых тэкстаў (напрыклад, малітве). 2) *Паведамленне* — намінацыя казнадзеям сваёй прамовы: «o tum będze kazanie» (СКАРГА-2, 115); «покажу теды в мове моей» (ГАЛЯТ., 481); «первую духовную Беседу» (СМАТР., 25). 3) *Адрасант* — аўтар, выкарыстоўваючы разнастайныя сродкі, так ці інакш прадстаўляе сябе. Да такіх сродкаў адносяцца: 1) выкарыстанне этыкетных формул, чым аўтар дэманструе свае веды ў галіне ars praedicandi ('мастацтва казнадзейства'); 2) разнастайныя спосабы ўводзін тэмы, што кваліфікуе аўтара з пункту гледжання ўмельства зацікавіць аўдыторыю; 3) непасрэдная прэзентацыя сябе (пры захаванні вобраза казнадзея наогул) — характэрна толькі для ПК Сматрыцкага. На думку В. У. Вінаградава, аўтары рытарычных твораў пры стварэнні «вобраза сябе» кіраваліся «калектыўнай маскай» — культурна-сацыяльным эталонам аратара-казнадзея[5].

Тэмы-2, заяўленыя ў exordium'е, разгортваюцца ў narratio па іерархічнаму прынцыпу: кожная з тэм-2 раскрываецца праз шэраг тэм трэцяга парадку — больш асобных тэм (далей тэмы-3). Фрагмент тэксту (у narratio), які змяшчае выклад адной тэмы (тэма заўсёды знаходзіцца ў абсалютным пачатку фрагменту), г. зн. тэматычны фрагмент, уяўляе сабой па сінтаксічнай будове адно складанае сінтаксічнае цэлае (далей ССЦ), калі ў ім выкладаецца тэма, непадзельная на больш асобныя тэмы. У адваротным выпадку, г. зн. наяўнасці раздзялення тэмы, тэматычны фрагмент грунтуецца на некалькіх ССЦ, у кожным з якіх разгортваецца больш асобная тэма.

У ПК выяўляецца пэўны **ізамарфізм кампазіцыі разгортвання тэмы** як на ўзроўні некалькіх ССЦ, так і на ўзроўні аднаго ССЦ. Кожны тэматычны фрагмент мае тэрнарную структуру: заява тэмы; дэманстрацыя альбо ў агульным сэнсе выклад тэмы; вывад (можа быць прадстаўлены як парада, настаўленне; у ПК Скаргі звычайна фармулюецца ў перыядзе). Так, пачатковы (непасрэдна адкрывае narratio) тэматычны фрагмент у першым казанні Скаргі складаецца з трох ССЦ (трох тэматычных фрагментаў, якія выкладаюць тэмы-3): у першым фармулюецца тэзіс; у другім змяшчаецца ілюстрацыя дадзенага тэзісу (спосаб ілюстрацыі — пералічэнне); у трэцім падводзіцца вывад выкладу (у выглядзе адказу на пытанне). Вывад таксама, як і ілюстрацыя, фармулюецца пры дапамозе пералічальных канструкцый.

/9/ Акрамя гэтага самага ў целе жыцця не многа убогаму смерць аднімае. Мала меў: не многа траціць... Але чалавек стану вялікага: з багатага становіцца ўбогі бядняк. Пакуль жыў, тысячы раскідваў, скрыні золата і серабра... і перлаў напаўняў.

З таго прыўзнятага і грамаднага... становіцца ў гробе і ў зямлі пакінуты і адхілены і асірацелы. З таго, перад каторым усе дрыжалі... становіцца пасмешышча і пагарда... З таго раскошнага, у стравах, у уборах... становіцца брыдкі і непрыстойны труп.

Ці так, як той Агаг кароль мовіў, горкая смерць чыніш аддзяленні? аддзяляеш ад грошай, ад багацця, ад роскашы, ад помпы... ад усяго адступіць і пакінуць усё загадваеш (СКАРГА-1, 125).

Пры вытрымліванні аднолькавай схемы разважання ў тэматычных фрагментах рознай ступені складанасці пералічальныя канструкцыі значна павялічваюць працягласць структуры фрагменту, і тое, што на ўзроўні аднаго ССЦ адпавядае 1—2 сказам, на ўзроўні некалькіх ССЦ займае адно з ССЦ цалкам.

Другі элемент структуры разважання ў тэматычным фрагменце на ўзроўні аднаго ССЦ — выклад тэмы — можа быць прадстаўлены як 1) дэманстрацыя тэмы (прыклады, сведчанні); 2) параўнанне; 3) катэхізісная форма (тэма задаецца як пытанне; выклад — адказ); 4) тлу-

мачэнне (раскрываюцца прычыны пэўнай з'явы); 5) цытата (прыводзіцца цытата са Св. Пісання як пацверджанне тэзісу). Ва ўсіх ПК дэманстрацыя ажыццяўляецца ў пералічальных канструкцыях, што ўзмацняе ўздзеянне прыёму і ствapae адчуванне поўнай вычарпальнасці, выкладзенасці тэмы. У рыторыках такі спосаб разгортвання вызначаўся як amplificatio ('пашырэнне').

Ізамарфізм прынцыпаў пабудовы тэксту на розных узроўнях (аднаго ССЦ, некалькіх, усяго казання цалкам: exordium — заява тэм; narratio — выклад тэм; conclusio — вынік) растлумачваецца імкненнем упарадкаваць матэрыял, арганізаваць яго больш аднолькава і, акрамя таго, прытрымлівацца найбольш прынятых форм разважання на пэўную тэму. Аднолькавасць спрыяе не толькі стварэнню цэласнасці, маналітнасці тэксту, але і больш лёгкаму яго ўспрыманню, засваенню матэрыялу. Апошняе з'яўляецца для казнадзея задачай нумар адзін.

Устойлівым пачаткам conclusio з'яўляецца зварот да слухачоў[6]. Мэты звароту: 1) у СКАРГА-2 — дасягнуць успрымання парад казнадзея: «Sluchayćiez dobrey nauki, namilszy wybrani Bozy!» (СКАРГА-2, 119); 2) у СКАРГА-1 — аплакаць смерць каралевы Анны; 3) у СМАТР. —усцешыць: «Радуймося Православныи Хрістіане, и тешмо: Умершу абовемъ Праведніку, мовитъ Премудрый, возвеселятся людіе» (СМАТР., 53). Зварот да слухачоў суправаджаецца панегірычным апісаннем спраў і заслуг нябожчыка. Заканчэннем conclusio і казання цалкам з'яўляецца зварот да Бога. У другім казанні Скаргі гэта зварот з просьбай аб міласці да нябожчыка і абяцаннем выканаць свой, зямны абавязак — маліцца за нябожчыка.

/10/ Божа, каб гэты нябожчык так мовіў, што пазбегнуў вечнай пакуты, вялікую надзею маем... А калі пакаранне недаўгавечнае за невыкананне пакуты ў тым жыцці зарабіў: дапамогу яму даць можам, і на тое (мы) сюды прышлі (СКАРГА-2, 119).

У Сматрыцкага ў звароце да Бога выказваецца надзея на выратаванне ўсёй Праваслаўнай царквы.

/11/ Узнесеную і абноўленую, ласкаю тваёю святою прыгнечанай Царквы нашай Рускай Святыню па-бацькоўскі песці, захоўвай, пашырай, і множ (СМАТР., 55).

У цэлым кампазіцыйныя прынцыпы ПК вызначаюцца дзвюма асноўнымі функцыямі, якія выконвае казнадзей у жалобным богаслужэнні. З аднаго боку, казнадзей выконвае ролю настаўніка, «пастыра авец Хрыстовых», г. зн. імкнецца да стварэння максімальна пераканаўчага тэксту. Надзвычайнасць тэмы — смерць чалавека — абумоўлівае і асаблівасць настаўленняў: кожная парада грунтуецца на глыбокіх філасофскіх разважаннях аб тым, што акрамя рэальнасці бачнага свету існуе нейкая нябачная, духоўная рэальнасць, першапачатковая і вечная. Нягледзячы на разнастайнасць тэматыкі казанняў, усе яны аб'ядноўваюцца адзінай ключавой сентэнцыяй: жыццё чалавека не спыняецца са смерцю цела. Казнадзей рыхтуе слухачоў да сур'ёзнага і разважлівага ўспрымання тэмы, таму exordium заўсёды мае ўзвышана-жалобны, нават, у казанні Сматрыцкага, трагічны характар. Аднак, з другога боку, казнадзей у жалобным богаслужэнні — постаць суцяшаючая. Яго мэтай з'яўляецца пэўнае псіхатэрапеўтычнае ўздзеянне па слухачоў пры дапамозе славеснага выразу, артыкулявання жалю. Адсюль змена мадальнасці прамовы ў conclusio: заключныя сентэнцыі маюць абнадзейлівы, супакойлівы характар. Калі ў exordium'е казнадзей звяртае ўвагу слухачоў на блізкасць «таго» свету, накіроўвае іх думкі да іншага, нябеснага жыцця, то ў conclusio адбываецца адваротнае — казнадзей вяртае слухачоў да зямных турбот, падкрэслівае, што нябожчык ужо Там, на іншым свеце, але жыццё працягваецца, зараз трэба выконваць Божыя запаведзі на зямлі.

[1] Гл.: Chroscicki J. Pompa funebris. Z dziejow kulturu staropolskiej. Warszawa, 1974. S. 72.

[2] Гл.: Полный православный богословский энциклопедический словарь. М., 1992. Т. 2. С. 61.

[3] Гл.: Петров Н. // Труды Киевской духовной академии. Киев, 1866. Т. 1. С. 86 і наст.; Мячкоўская Н. Б. // XI Міжнародны з'езд славістаў. Даклады. Мн. 1993. С. 18 і наст.

[4] Гл.: Ulčinaite E. Teoria retoryczna w Polsce i na Litwie w XVII wieku. Wroclaw, 1984. S. 68 і наст.

[5] Гл.: Виноградов В. В. О теории художественной речи. М., 1971. С. 145.

[6] Паколькі арыгінал казання І. Галятоўскага захаваўся не цалкам, кампазіцыя conclusio разглядаецца на прыкладах казанняў П. Скаргі і М. Сматрыцкага.